

# 80 гадоў – узрост поспеху!

## Ад інстытута да ўніверсітэта

Гродзенскаму дзяржаўнаму ўніверсітэту імя Янкі Купалы – 80 гадоў! Гэта знакавая дата для сённяшняга калектыву студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў, ветэранаў і дзясяткаў тысяч выпускнікоў!

Старонкі летапісу ўніверсітэта складаюць гады плённай працы, навуковага і творчага пошуку, заслужанага прызнання і паспяховай практычнай дзейнасці. Традыцыі, закладзеныя вучонымі, фундаментальная і прыкладная навука, высокі ўзровень выкладання сфарміравалі сучасны імідж ГрДУ імя Янкі Купалы як цэнтра адукацыі, навукі, культуры і інавацый, зрабілі яго вядомым у краіне і ў міжнароднай адукацыйнай прасторы.

За восем дзесяцігоддзяў універсітэт прайшоў плённы і адметны шлях – ад настаўніцкага інстытута да шматпрофільнага ўніверсітэта, ад двух аддзяленняў да 15 факультэтаў, ад дзвюх спецыяльнасцей да амаль 60, ад 100 першых студэнтаў да больш як 12 тысяч цяперашніх, ад падрыхтоўкі педагогаў для сярэдняй школы да спецыялістаў для лічбавай эканомікі.

Слаўная гісторыя Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы распачалася 22 лютага 1940 года, калі праз паўгода пасля далучэння Заходняй Беларусі да БССР быў створаны Настаўніцкі інстытут, якому адводзілася асаблівая роля ў падрыхтоўцы кваліфікаваных кадраў, паколькі ён стаў першай вышэйшай навучальнай установай у Заходняй Беларусі.

Свае карэктывы ў развіццё ўніверсітэта ўнесла вайна. З першага набору студэнтаў, якіх было каля ста, на заняткі вярнуўся толькі адзін. Пасля вызвалення БССР у 1944 годзе навучальная ўстанова аднавіла




**Ірына Фёдараўна Кітурка, рэктар**

сваю дзейнасць у статусе Педагагічнага інстытута. Заняткі праводзіліся на трох факультэтах – фізіка-матэматычным, літаратурным і факультэце замежных моў. Праз пяць гадоў быў адкрыты гістарычны факультэт.

Знакавым стаў 1978 год, калі на базе інстытута быў створаны ўніверсітэт – трэці ў рэспубліцы ўніверсітэт класічнага тыпу, якому ў 1988 годзе было прысвоена імя народнага паэта Беларусі Янкі Купалы. І сёння пачэсны брэнд «Купалаўскі ўніверсітэт» вядомы не толькі ў нашай краіне, але і далёка за яе межамі, а кожны наш навучэнец і супрацоўнік з гонарам называе сябе купалаўцам!




Мы ганарымся багатай гісторыяй, шануем традыцыі і ўпэўнена крочым наперад у адпаведнасці з місіяй універсітэта: «Выявіць, раскрыць і рэалізаваць патэнцыял чалавека і ўніверсітэта ў прасторы міжкультурнага дыялогу». Накіраванасць у будучыню – сутнасць сённяшняга дня ўніверсітэта. Час ставіць перад намі новыя задачы: развіваць інавацыйнае асяроддзе, арыентаваць навуковыя распрацоўкі на патрэбы рэальнага сектара эканомікі, сацыяльнай сферы і камерцыялізаваць іх. Ад паспяховага вырашэння гэтых задач залежаць рост эканомікі і дабрабыту людзей, канкурэнтаздольнасць нашага ўніверсітэта і дзяржавы ў цэлым.

## Адукацыя праз усё жыццё

ГрДУ імя Янкі Купалы – буйнейшы ўніверсітэцкі комплекс Рэспублікі Беларусь з размешчаных у рэгіёнах. Адметнай яго асаблівасцю з'яўляецца шматпрофільнасць навуковых даследаванняў і адукацыйных праграм.




**Штогод студэнтамі ГрДУ імя Янкі Купалы становяцца больш за 2500 чалавек**

Гэта адзіны ўніверсітэт у рэгіёне, які пры адсутнасці спецыяльнай тэхнічнай вышэйшай навучальнай установы арганічна спалучае падрыхтоўку, перападрыхтоўку і павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў з сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыяй, падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі, навуковыя даследаванні і інавацыйную дзейнасць у інтарэсах практычна ўсіх галін эканомікі і сацыяльнай сферы. У структуры ўніверсітэта 15 факультэтаў, 62 кафедры, 4 каледжы (Гуманітарны, Тэхналагічны, Лідскі і Ваўкавыскі), Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў, Цэнтр трансферу тэхналогій, Навукова-тэхналагічны парк.

Сёння ГрДУ імя Янкі Купалы ажыццяўляе падрыхтоўку кадраў па 26 спецыяльнасцях сярэдняй спецыяльнай адукацыі, 52 спецыяльнасцях першай ступені і 53 спецыяльнасцях другой ступені вышэйшай адукацыі, 41 спецыяльнасці паслявузаўскай адукацыі і 16 спецыяльнасцях перападрыхтоўкі кадраў. Такім чынам, мы забяспечваем рэалізацыю парадыгмы «адукацыя праз усё жыццё» па ўсіх профілях падрыхтоўкі спецыялістаў, за выключэннем медыцынскага і аграрнага.

Аператыўна рэагуючы на патрэбы эканомікі і сацыяльнай сферы, ва ўніверсітэце штогод адкрываюцца новыя спецыяльнасці. Падчас прыёмнай кампаніі 2020 года абітурыентам будуць прапанаваны чатыры новыя спецыяльнасці, арыентаваныя на падрыхтоўку спецыялістаў лічбавай эканомікі. Развіваецца дыстанцыйная тэхналогія навучання, якая адпавядае патрабаванням сучаснай адукацыі.

Калектыў ГрДУ імя Янкі Купалы – адзін з самых вялікіх у Гродзенскай вобласці: 1930 чалавек, у тым ліку 720 выкладчыкаў, сярод якіх 45 дактароў і 330 кандыдатаў навук. 51,5 % выкладчыкаў ма-






**19 кастрычніка 2018 года Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка наведаў ГрДУ імя Янкі Купалы. Гэта першы візіт кіраўніка дзяржавы ў гісторыі ўніверсітэта**

юць вучоныя ступені і званні, а іх сярэдні ўзрост – 46 гадоў. Развіццё персаналу – адна з галоўных задач універсітэта, якая адлюстроўваецца ў кадравай палітыцы ўніверсітэта і дасягаецца разнастайнымі метадамі – ад сістэмы стымулявання эфектыўнай працы на падставе індывідуальных і кафедральных рэйтынгаў да накіравання выкладчыкаў на навучанне ў аспірантуру і дактарантуру айчынных і замежных навуковых цэнтраў, выдзялення з пазабюджэтных сродкаў рэктарскіх грантаў для завяршэння доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый.

Сваю дзейнасць наш універсітэт ажыццяўляе ў адпаведнасці са Стратэгіяй на 2016–2020 гады (у 2018 г. была распрацавана і зацверджана трэцяя версія) і праграм яе рэалізацыі па асноўных напрамках: навучальны працэс, навуковая і інавацыйная дзейнасць, ідэалагічная і выхаваўчая праца, інтэрнацыяналізацыя.

Мы разглядаем шматузроўневасць і шматпрофільнасць нашага ўніверсітэта як значную канкурэнтную перавагу і арганізуем навучальны працэс і навуковыя даследаванні на прынцыпах пераемнасці і міждысцыплінарнасці.

## Універсітэт педагагічных інавацый

У сучасных умовах неад’емнымі патрабаваннямі да спецыялістаў з’яўляюцца здольнасць дзейнічаць у сітуацыях нявызначанасці, аператыўна выкарыстоўваць вялікія масівы інфармацыі і прымаць нестандартныя рашэнні. Значэнне гэтых патрабаванняў будзе ўзрастаць, таму сучаснаму ўніверсітэту неабходна прымяняць інавацыйныя адукацыйныя тэхналогіі ў навучальным працэсе.

У ГрДУ імя Янкі Купалы створаны і эфектыўна функцыянуе адукацыйны інтэрнэт-партал, дзякуючы якому выкладчыкі і студэнты не толькі карыстаюцца шырокім наборам інфармацыйных паслуг, але і атрымліваюць якасна новыя магчымасці для ўзаемадзеяння пры рэалізацыі адукацыйных праграм. Інтэрактыўныя модулі партала – надзвычай запатрабаваны інструмент, які дае магчымасць рэалізаваць індывідуальную траекторыю навучання студэнтаў з улікам іх індывідуальных запытаў і патрабаванняў. Адукацыйны партал дазваляе ў любы час з любой кропкі свету і з любога гаджэту кожнаму студэнту атрымаць доступ да неабходных матэрыялаў.

Магчымасці адукацыйнага партала спрыяюць ажыццяўленню паўнавартаснага навучання студэнтаў у межах адукацыйнай мадэлі, якая грунтуецца на ідэі супрацоўніцтва са студэнтамі, ператварае выкладчыка ў мадэратара дыскусій і разнастайных інтэрактыўных формаў навучання. Усё гэта стварае ўмовы для арганізацыі прадуктыўнага ўзаемадзеяння студэнтаў і выкладчыкаў, выпрацоўвае ў іх запатрабаваныя на рынку працы прафесійныя кампетэнцыі.

У 2015 годзе ў ГрДУ імя Янкі Купалы была распрацавана Канцэпцыя практыка-арыентаванай адукацыі. У адпаведнасці з ёй на кожным факультэце



**У адукацыйным працэсе выкладчыкі ўніверсітэта выкарыстоўваюць разнастайныя інтэрактыўныя формы навучання**

створаны каардынацыйныя саветы па падрыхтоўцы кадраў, большасць з якіх складаюць прадстаўнікі заказчыкаў кадраў і мясцовых органаў улады. Зыходзячы з рэальных і перспектыўных патрэб, каардынацыйныя саветы аптымізуюць навучальныя планы, праграмы, прапаноўваюць тэматыку дыпломных работ і магістарскіх дысертацый, спрыяюць працаўладкаванню выпускнікоў.

З 2016 года ва ўніверсітэце ўкараняецца праектны метад правядзення дзяржаўных экзаменаў, які спалучае ў сабе шырокі ахоп зместу засвоеных дысцыплін і магчымасць дэманстрацыі творчага прафесійнага патэнцыялу студэнта.

Значным вынікам рэалізацыі Канцэпцыі практыка-арыентаванай адукацыі стала стварэнне разам з Гродзенскім абласным выканаўчым камітэтам і заказчыкамі кадраў першага ў краіне Інавацыйнага медыйнага кластара, Гродзенскага абласнога адукацыйнага кластара і Інавацыйнага кластара па фарміраванні кіраўніцкага патэнцыялу рэгіёна. Гэта дазваляе ўніверсітэту павышаць якасць падрыхтоўкі спецыялістаў, правядзення практык, працаўладкавання, узмацняць сувязь навуковых і іншых распрацовак з патрэбамі вобласці, а нашым партнёрам – атрымліваць навуковую і арганізацыйна-метадычную падтрымку сваёй дзейнасці, крэатыўных і матываваных спецыялістаў.

Прыкладны характар мае і навукова-даследчая дзейнасць студэнтаў, у тым ліку і на этапе падрыхтоўкі да выніковай атэстацыі. Штогод значная колькасць курсавых, дыпломных праектаў (работ) і магістарскіх дысертацый студэнтаў-купалаўцаў выконваецца па заяўках арганізацый рэальнага сектара эканомікі і сацыяльнай сферы.

З мэтай развіцця камунікацыйных кампетэнцый спецыялістаў, фарміравання здольнасцей эфектыўна ўзаемадзейнічаць у камандзе з 2017 года ў ГрДУ імя Янкі Купалы рэалізуюцца міждысцыплінарныя праекты ў групе студэнтаў розных спецыяльнасцей і факультэтаў. Сфарміраваць такую групу з курсавікоў, дыпломнікаў і магістрантаў дазваляе шматпрофільнасць універсітэта. Вынікам рэалізацыі праектаў з’яўляюцца рэальныя прадукты, якія ўкараняюцца ў эканоміку, сацыяльную сферу і навучальны працэс. Сярод паспяхова выкананых і рэалізаваных праектаў – чат-бот «Электронны даведнік па гістарычных аб’ектах горада Гродна» на рускай, беларускай, англійскай і кітайскай мовах. Вынікам тэхнічнага праекта, выкананага выпускнікамі факультэта інавацыйных тэхналогій машынабудавання і фізіка-тэхнічнага факультэта па заяўцы ААТ «ГроднаАзот», сталі прапановы канструктарска-тэхналагічных рашэнняў па мадэрнізацыі і павышэнні эксплуатацыйнага рэсурсу помпы, прызначанай для транспарціроўкі вадкай серы на прадпрыемстве.

Неад’емным кампанентам інавацыйнай арганізацыі адукацыйнага працэсу з’яўляецца развіццё педагагічных кампетэнцый выкладчыкаў. У дадзеным выпадку пад інавацыямі разумеецца не толькі працэс стварэння, выкарыстання і распаўсюджвання новага, але ў першую чаргу змены ў свядомасці выкладчыка, яго стылі мыслення, вобразе дзейнасці.

З гэтай нагоды ўжо два гады для выкладчыкаў універсітэта, каледжаў, настаўнікаў школ мы рэалізуем інавацыйную адукацыйную праграму павышэння кваліфікацыі «Універсітэт адукацыйных інавацый», дзякуючы якой слухачы курсаў павышэння кваліфікацыі засвойваюць і выкарыстоўваюць у навучальным працэсе тэхналогіі актыўнага навучання, вучацца працаваць з лічбавымі адукацыйнымі рэсурсамі, набываюць вопыт сумеснага пошуку



**Студэнты ўніверсітэта падчас рэалізацыі міждысцыплінарных праектаў ствараюць 3D-мадэлі архітэктурных помнікаў**



**Студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы з першых курсаў знаходзяцца ў прафесійным асяроддзі**

крэатыўных ідэй і рашэнняў, удасканальваюць камунікатыўныя кампетэнцыі ў галіне англамоўных прафесійных зносін.

Важным элементам інавацыйнага асяроддзя ўніверсітэта з’яўляецца створаны ў 2016 годзе электронны навукова-метадычны часопіс «Універсітэт адукацыйных інавацый». Інфармацыйна-камунікатыўная прастора часопіса прадстаўляе магчымасць для дыялогу па пытаннях выкарыстання інавацыйных адукацыйных тэхналогій і абмену вопытам навукоўцаў, педагогаў-практыкаў, настаўнікаў, студэнтаў па пытаннях развіцця адукацыі ў сучасных умовах, што дазваляе актыўна ўкараняць інавацыйны вопыт у адукацыйны працэс ва ўніверсітэце, бачыць зваротную сувязь, прэзентаваць вынікі.



**Для выкладчыкаў універсітэта, каледжаў, настаўнікаў школ рэалізуецца інавацыйная адукацыйная праграма павышэння кваліфікацыі «Універсітэт адукацыйных інавацый»**

Аўтарамі часопіса з моманту яго стварэння сталі 76 чалавек, сярод іх 6 дактароў навук, 38 кандыдатаў навук, 6 педагогаў школ, гімназій і ліцэяў. У часопісе апублікавана 57 навукова-метадычных артыкулаў, 17 метадычных распрацовак, адлюстраваны вынікі падрыхтоўкі 15 студэнцкіх праектаў. Артыкулы і метадычныя распрацоўкі часопіса змяшчаюцца ў бібліяграфічнай базе даных РІНЦ.

## Тэрыторыя апераджальнага развіцця

ГрДУ імя Янкі Купалы – гэта таксама навуковы і інавацыйны цэнтр Гродзенскага рэгіёна, у якім праводзяцца фундаментальныя і прыкладныя даследаванні па прыярытэтных напрамках развіцця навукі і тэхналогій.

Арганізуючы цеснае супрацоўніцтва з вядучымі прадпрыемствамі і арганізацыямі Рэспублікі Беларусь (ААТ «Гродна Азот», ААТ «Лакафарба», ААТ «Завод «Оптык», РУП «Белтэлекам», ААТ «Гродзенскі мясакамбінат», ТАА «Гроднажылбуд», ТДА «Фірма АВС», ААТ «Скідзельскі цукровы камбінат», ААТ «Пружанскі льнозавод», ААТ «Аўтобусны парк г. Гродна», ААТ «Беллакт» і інш.), а таксама з замежнымі партнёрамі з розных краін свету, ва ўніверсітэце штогод выконваецца больш за 140 навуковых праектаў, 40 % з якіх – за кошт пазабюджэтных сродкаў. Вынікі рэалізацыі прыкладных праектаў, доля якіх складае больш за 65 % ад агульнай колькасці навуковых прац, служаць асновай для стварэння інавацыйных распрацовак і новай навукаёмістай прадукцыі з высокай дабаўленай вартасцю, якая ў тым ліку з’яўляецца асновай экспарту.

Статус акрэдытаванай навуковай арганізацыі, наяўнасць аўтарытэтных навукова-педагагічных школ дазваляюць нашаму ўніверсітэту выконваць функцыі галаўной арганізацыі рэгіянальнай навукова-тэхнічнай праграмы «Устойлівае інавацыйнае развіццё Гродзенскай вобласці» на 2016–2020 гады.

Ва ўніверсітэце створана і ўдасканальваецца комплексная сістэма падтрымкі прафесійнага і навуковага станаўлення студэнтаў і навукоўцаў, што адлюстроўваецца ў штогадовых выніках іх навуковай дзейнасці, апублікаваных у навуковых выданнях з высокім індэксам цытавання. Агульная колькасць высокарэйтынгавых навуковых прац супрацоўнікаў універсітэта, якія ўлічваюцца ў міжнародных базах даных Scopus і Web of Science, складае больш за 800 артыкулаў, а ў базу даных РІНЦ за апошнія тры гады ўнесены больш за 1700 артыкулаў нашых даследчыкаў.

Адным з прыярытэтных напрамкаў універсітэцкай навукі з’яўляецца арганізацыя эфектыўнай навукова-даследчай працы студэнтаў. Інфраструктура студэнцкай навукі ўключае 63 навуковыя гурткі, 4 студэнцкія навуковыя лабараторыі і 2 канструктарскіх бюро, у якіх задзейнічана больш за 1700 членаў студэнцкага навуковага таварыства. Штогод больш за 90 % студэнцкіх навуковых прац, накіраваных на рэспубліканскі конкурс, з’яўляюцца пераможцамі або займаюць прызавыя месцы. Студэнты друкуюць больш за 2000 артыкулаў у розных выданнях, а чацвёртая частка ўсіх навуковых праектаў, што выконваюцца ва ўніверсітэце, рэалізуецца маладымі навукоўцамі.

Ва ўніверсітэце эфектыўна функцыянуюць 18 навукова-педагагічных школ, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку навуковых работнікаў вышэйшай кваліфікацыі па 41 спецыяльнасці ў межах 11 галін навук. Дзейнічаюць два саветы па абароне дысертацый, за ўвесь перыяд працы якіх абаронена больш за 90 дысертацый. Распрацоўка і ўкараненне сістэмы комплексных мер, якія спрыяюць стымуляванню навуковай і інавацыйнай дзейнасці, дазволілі забяспечыць за апошнія пяць гадоў абарону супрацоўнікамі ўніверсітэта 8 доктарскіх і 73 кандыдацкіх дысертацый.

ГрДУ імя Янкі Купалы – першы з універсітэтаў, размешчаных у рэгіёнах Рэспублікі Беларусь, у 2017 годзе ў ліку сямі вядучых універсітэтаў краіны стаў удзельнікам эксперыментальнага праекта Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь па ўкараненні мадэлі «Універсітэт 3.0». Рэалізацыя дадзенай мадэлі дазволіць пératварыць універсітэт у суб’ект эканомікі ведаў, арыентаваны не толькі на навучанне і навуковыя даследаванні, але і на іх камерцыялізацыю, фарміраванне бізнес-кампетэнцый у студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў універсітэта.

З 2017 года ва ўніверсітэце актыўна развіваюцца суб’екты інавацыйнай інфраструктуры – Цэнтр трансферу тэхналогій і Навукова-тэхналагічны парк. Адна з функцый Тэхнапарка ў цесным узаемадзеянні з Цэнтрам трансферу тэхналогій – падтрымка і суправаджэнне студэнцкіх праектаў «ад ідэі да вытворчасці», бізнес-інкубіраванне малых інавацыйных прадпрыемстваў. Для матэрыяльнай падтрымкі навуковай і інавацыйнай дзейнасці студэнтаў і супрацоўнікаў ва ўніверсітэце створана ўласная сістэма стымулявання, якая ўключае Фонд інавацыйнага развіцця ўніверсітэта, імянныя стыпендыі, арганізацыю стажыровак у вядучых навуковых цэнтрах, персанальнае навуковае суправаджэнне маладых навукоўцаў і інш.

Асаблівае значэнне надаецца развіццю студэнцкага стартап-руху, што знайшло сваё ўвасабленне ў адкрытых конкурсах студэнцкіх стартап-праектаў, якія штогод праводзяцца на базе ўніверсітэта. З мэтай фарміравання ў студэнтаў і супрацоўнікаў лідарскіх якасцей, камунікатыўных навыкаў і навыкаў праектнай дзейнасці, стварэння і развіцця ўласнага бізнесу ў 2019 годзе мы адкрылі «Студыю праектаў і стартапаў».

Сёння перад намі стаіць задача забяспечыць высокую ўключанасць універсітэта ў эканамічнае і сацыяльнае развіццё рэгіёна і краіны ў цэлым. Менавіта Навукова-тэхналагічны парк дае нам новыя магчымасці для камерцыялізацыі навуковых і інавацыйных распрацовак навукоўцаў і студэнтаў універсітэтаў, фарміравання «прафесій будучыні». Рэсурсы Тэхнапарка шляхам распрацоўкі і рэалізацыі інавацыйных і інвестыцыйных праектаў дазволяць стварыць новыя высокатэхналагічныя вытворчасці, а на іх базе – сумесныя прадпрыемствы – рэзідэнты Тэхнапарка. У сваю чаргу створаныя інавацыйныя прадпрыемствы стануць базай для практычнай падрыхтоўкі спецыялістаў па актуальных і перспектыўных прафесіях.




**Урачыстае адкрыццё новага будынка Навукова-тэхналагічнага парка ГрДУ імя Янкі Купалы. Лістапад 2018 года**



**Арганізацыя эфектыўнай навукова-даследчай працы студэнтаў – адзін з прыярытэтных напрамкаў універсітэцкай навукі**

У 2019 годзе статус рэзідэнтаў Тэхнапарка ўжо атрымалі тры новыя інавацыйныя прадпрыемствы, заснаваныя супрацоўнікамі і студэнтамі ўніверсітэта. Адно з іх стала вынікам дзейнасці студэнцкага канструктарскага бюро, стартап якога перарос у малое прадпрыемства. Сёння яно актыўна займаецца распрацоўкай і ўкараненнем лічбавых тэхналогій мадэлявання і праектавання ў будаўніцтве.

## Універсітэт магчымасцей

Галоўнае багацце ўніверсітэта – яго супрацоўнікі і студэнты. Мы імкнёмся, каб для кожнага купалаўца Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы стаў тэрыторыяй рэалізацыі яго магчымасцей. У інтарэсах супрацоўнікаў развіваюцца шматлікія напрамкі ўдасканалення прафесійных і асобасных кампетэнцый. На гэта накіраваны дзейнасць «Школы кіраўніка», інстытут настаў-



Удзельнікі конкурсу «Міс і Містар універсітэт»



Студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы штогод у ліку лепшых студатрадаўцаў вобласці і краіны

ніцтва маладых спецыялістаў, сістэма фарміравання і развіцця кадравага рэзерву, сістэма прафесійнага навучання, праграма сацыяльнай падтрымкі.

Студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы маюць магчымасць арганізаваць сваю пазавучэбную дзейнасць у адпаведнасці з талентам і здольнасцямі. Першая лекцыя, якую па традыцыі чытаюць першакурснікам, так і называецца: «Універсітэт тваіх магчымасцей». З першых дзён і на працягу ўсіх гадоў вучобы студэнты могуць праяўляць лідарскія якасці, дэманстраваць здольнасці ў студэнцкіх атрадах падчас трэцяга працоўнага семестра, самарэалізоўвацца ў розных сферах дзейнасці праз удзел у разнастайных гуртках, творчых калектывах і спартыўных секцыях. У выніку ў маладых людзей фарміруюцца кампетэнцыі, неабходныя кожнаму высокакваліфікаванаму, канкурэнтаздольнаму спецыялісту і грамадзяніну з актыўнай жыццёвай пазіцыяй.

Назапашаны вопыт работы з моладдзю знайшоў адлюстраванне ў распрацаванай у 2019 годзе Канцэпцыі арганізацыі працы з адоранай і таленавітай моладдзю: ад выяўлення здольнасцей абітурыентаў да ўсебаковай падтрымкі самарэалізацыі маладых купалаўцаў, якія асабліва праявілі сябе ў адукацыйнай, навуковай, творчай і спартыўнай дзейнасці. За кошт пазабюджэтных сродкаў мы стварылі ўніверсітэцкі фонд «Таленавітая моладзь», з якога фінансуюцца падрыхтоўка і ўдзел студэнтаў у абласных, рэспубліканскіх і міжнародных інтэлектуальных, творчых і спартыўных спаборніцтвах.

З мэтай актывізацыі работы са студэнцкім актывам і садзеяння развіццю таленавітай моладзі ва ўніверсітэце рэалізуецца комплексная праграма «Лідар», функцыянуюць навучальныя семінары «Школа лідара», «Школа важацкага майстэрства», «Школа камандзіраў студэнцкіх атрадаў». На аб’яднанне рэсурсаў і патэнцыялу дзеля выніковай і эфектыўнай рэалізацыі ідэй і мерапрыемстваў накіравана дзейнасць першасных арганізацый грамадскіх аб’яднанняў, органаў студэнцкага самакіравання. Так, па ініцыятыве студэнцкага самакіравання ва ўніверсітэце праводзіцца каля 40 % мерапрыемстваў выхаваўчага характару.

Галоўная задача выхавання – стварэнне ўмоў для актыўнай дзейнасці студэнтаў, грамадзянскага самавызначэння і самарэалізацыі, максімальнага задавальнення патрэб студэнтаў у інтэлектуальным, культурным і духоўным развіцці. Сёння ва ўніверсітэце працуе 115 аб’яднанняў па інтарэсах рознага профілю, у якіх займаецца больш за 30 % студэнтаў, у тым ліку чатыры народныя калектывы – ансамбль народнай песні «Ясніца», клуб славянскіх адзінаборстваў «Арыдан», аркестр народных інструментаў і студэнцкі тэатр «Вернісаж».

Традыцыйна ва ўніверсітэце праходзяць выхаваўчыя мерапрыемствы рознай накіраванасці: прымеркаваныя да дзяржаўных і прафесійных свят, памятных дат, фотавыставы, літаратурныя конкурсы і інш.

Асаблівая ўвага надаецца грамадзянска-патрыятычнаму выхаванню моладзі, рэалізуюцца праект «Жывая гісторыя», акцыі «Чытаем Купалу разам», «Зорныя паходы» па месцах баявой славы, Дзень нараджэння ўніверсітэта, цыкл мерапрыемстваў, прымеркаваных да Года малой радзімы, і інш. Адным з асноўных мерапрыемстваў у галіне патрыятычнага выхавання з’яўляецца грамадзянска-патрыятычны марафон «Разам – за моцную і квітнеючую Беларусь!». З 2015 года ён праводзіцца па ініцыятыве студэнтаў універсітэта, а ў 2018 годзе набыў статус рэспубліканскага мерапрыемства. За рэалізацыю праектаў па грамадзянска-патрыятычным выхаванні ў 2019 годзе ўніверсітэт атрымаў падзяку Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Значнае месца ў сістэме ідэалагічнай і выхаваўчай працы займае духоўнае і эстэтычнае выхаванне мо-

ладзі. Па выніках рэспубліканскага фестывалю мастацкай творчасці студэнцкай моладзі «АРТ-вакацыі – 2018» студэнты атрымалі Гран-пры, 15 дыпломаў рознай ступені, а калектыў універсітэта ўдастоены падзякі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь за шматгадовую плённую дзейнасць па захаванні традыцый і папулярызацыі дасягненняў аматарскіх калектываў, садзейнічанне развіццю інавацыйных формаў моладзевай творчасці.

Штогод студэнты ўніверсітэта прымаюць удзел у рабоце студэнцкіх атрадаў падчас трэцяга працоўнага семестра. Так, у 2018/2019 навучальным годзе дзейнічала 39 студэнцкіх атрадаў, у якіх працавалі 630 студэнтаў-купалаўцаў. На працягу апошніх гадоў Штаб працоўных спраў універсітэта лічыцца лепшым у Гродзенскай вобласці, а па выніках 2017 і 2018 гадоў прызнаны лепшым у рэспубліцы. У цяперашні час у ГрДУ імя Янкі Купалы функцыянуе 27 валанцёрскіх атрадаў, у склад якіх уваходзяць 733 валанцёры, а 285 студэнтаў працавалі валанцёрамі на II Еўрапейскіх гульнях. 289 студэнтаў прынялі актыўны ўдзел у арганізацыі перапісу насельніцтва Рэспублікі Беларусь 2019 года на стацыянарных участках г. Гродна.

Ва ўніверсітэце склаліся даўнія традыцыі ў развіцці спорту вышэйшых дасягненняў і масавага спорту. Студэнты штогод прымаюць удзел у спаборніцтвах сусветнага і еўрапейскага ўзроўняў, Спартакіядзе Саюзнай дзяржавы, чэмпіянатах Рэспублікі Беларусь і іншых фізкультурна-спартыўных мерапрыемствах. У склад зборных нацыянальных каманд Рэспублікі Беларусь па відах спорту ўваходзіць 71 студэнт універсітэта. Штогод на міжнародных спаборніцтвах купалаўцы заваёўваюць больш за 60 медалёў рознай вартасці. Чатыры студэнты – прызёры II Еўрапейскіх гульняў.

Нямала ва ўніверсітэце зроблена для развіцця масавага спорту – створаны спартыўныя секцыі, сфарміраваны групы спартыўнага вучэбнага аддзялення па розных відах спорту, штогод праводзяцца спартакіяды сярод навучэнцаў і супрацоўнікаў, турыстычныя злёты, дні здароўя і іншыя мерапрыемствы спартыўна-аздараўленчага характару.



**Студэнты ГрДУ імя Янкі Купалы – прызёры II Еўрапейскіх гульняў**

## Універсітэт у міжнародным дыялогу

Неад'емнай часткай развіцця канкурэнтаздольнага на міжнародным узроўні ўніверсітэта з'яўляецца інтэрнацыяналізацыя. ГрДУ імя Янкі Купалы ўпершыню ў Беларусі заявіў і сертыфікаваў інтэрнацыяналізацыю як асноўны працэс сістэмы менеджменту якасці.

Актыўная міжнародная дзейнасць універсітэта рэалізуецца ў межах больш за 200 міжвузаўскіх дамоў аб супрацоўніцтве з замежнымі ўстановамі з 33 краін свету. Універсітэт з'яўляецца членам 13 міжнародных сетак і асацыяцый, сярод якіх Еўрапейская асацыяцыя ўніверсітэтаў (EUA), Сетка ўніверсітэтаў рэгіёна Балтыйскага мора (BSRUN), Еўразійская асацыяцыя ўніверсітэтаў (EUA), Група Універсітэтаў Кампастэла (CGU), Праграма «Балтыйскі ўніверсітэт» (BUP) і інш.

За апошнія пяць гадоў больш за 250 супрацоўнікаў і студэнтаў універсітэта атрымалі гранты на навучанне і праходжанне стажыровак па праграме Erasmus +, рэалізавана каля 40 міжнародных праектаў з агульным аб'ёмам фінансавання больш за 6 млн еўра. У бягучым годзе рэалізуюцца 22 праекты міжнароднай тэхнічнай дапамогі. Нашы выкладчыкі чыталі лекцыі ў Берлінскім універсітэце імя Гумбальта (Германія), Цюбінгенскім універсітэце (Германія), Універсітэце Кіла (Вялікабрытанія), Універсітэце Алькала (Іспанія) і іншых універсітэтах Еўропы.

Сёння асабліва прыкметным з'яўляецца рост паказчыкаў акадэмічнай мабільнасці не толькі ў колькасным, але і ў якасным выражэнні. Ва ўніверсітэце значная ўвага надаецца праграме «Запрошаны прафесар». Дадзеная праграма для нас – гэта не толькі магчымасць праслухаць лекцыі вядучых сусветных экспертаў, але і механізм развіцця супрацоўніцтва паміж універсітэтамі і краінамі. За апошнія пяць гадоў ва ўніверсітэце працавалі каля 200 запрошаных прафесараў з амаль 20 краін свету.

Ва ўніверсітэце асвоена і запатрабавана практыка правядзення стажыровак і іншых відаў адукацыйных паслуг для замежных магістрантаў, аспірантаў, выкладчыкаў. Нашы лепшыя выкладчыкі выступаюць навуковымі кіраўнікамі аспірантаў з замежных краін.

Пашыраецца спектр англамоўных адукацыйных праграм. На сённяшні дзень ажыццяўляецца навучанне на англійскай мове па 23 адукацыйных праграмах вышэйшай адукацыі (з іх 18 – магістарскія) і 5 спецыяльнасцях аспірантуры. Як вынік, ва ўніверсітэце навучаецца больш за 900 замежных студэнтаў. З 2016 года мы сталі членамі і нацыянальнымі прад-



Урачыстае адкрыццё Базы стажыроўкі работнікаў правінцыі Ганьсу КНР









Падпісанне мемарандума аб узаемаразуменні паміж Універсітэтам Вісконсін (ЗША) і ГрДУ імя Янкі Купалы



У ГрДУ імя Янкі Купалы навучаецца больш за 900 замежных студэнтаў

стаўнікамі ESN – Erasmus Student Network – арганізацыі студэнтаў, місія якой заключаецца ў тым, каб прадстаўляць замежных студэнтаў у розных краінах і тым самым забяспечваць магчымасць для культурнага ўзаемаразумення і самаразвіцця ў адпаведнасці з прынцыпам «Дапамога навучэнцам».

Адным з механізмаў рашэння задач інтэграцыі ў сусветную адукацыйную прастору выступае праектаванне і рэалізацыя сумесных адукацыйных праграм. Гэты надзвычай складаны напрамак атрымаў развіццё ў нашым універсітэце ў межах супрацоўніцтва з універсітэтамі Кітайскай Народнай Рэспублікі, Рэспублікі Шры-Ланка і ЗША. У ліпені 2019 года падпісаны мемарандум аб узаемаразуменні паміж Універсітэтам Вісконсін (ЗША) і нашым універсітэтам, дасягнуты дамоўленасці аб рэалізацыі праекта «Аб'яднаны ўніверсітэт», які прадугледжвае навучанне замежных грамадзян у ГрДУ імя Янкі Купалы на працягу першых двух гадоў з далейшым прадаўжэннем навучання ва Універсітэце Вісконсін па праграме «2 + 2».

Інтэрнацыяналізацыя адукацыі ў Купалаўскім універсітэце накіравана не толькі на ўкараненне міжнародных і міжкультурных механізмаў у беларускую адукацыю, але і на распаўсюджанне беларускага вопыту, ідэй, культуры ў іншых краінах. Створаны і паспяхова функцыянуе Цэнтр беларускай мовы і культуры на базе філалагічнага факультэта Маскоўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя М. В. Ламаносава, арганізавана праца летніх і зімовых школ для замежных грамадзян. Напрыклад, у 2015 годзе ўпершыню ў нашым універсітэце прайшла Летняя школа рускай мовы, у якой за пяць гадоў прынялі ўдзел каля 200 чалавек з 21 краіны. Але мы не спыняемся на дасягнутым, і ў 2020 годзе запланавана правядзенне 11 спецыялізаваных школ. Вывучаць рускую мову ў ГрДУ імя Янкі Купалы штогод прыязджаюць прадстаўнікі правінцыі Ганьсу. У 2018 годзе ва ўніверсітэце была адкрыта і працягвае дзейнічаць База стажыроўкі работнікаў правінцыі Ганьсу КНР.

## Лічбавы ўніверсітэт+

Развіццё ўніверсітэта як аб’екта кіравання і ўваходжанне ў сусветную адукацыйную прастору запатрабавалі намаганняў па аўтаматызацыі кіравання, што спрыяла стварэнню ўласных асобных камп’ютарных сэрвісаў і абумовіла паступовую лічбавую трансфармацыю ўніверсітэта. Асноўныя напрамкі гэтага працэсу ГрДУ імя Янкі Купалы вызначыліся яшчэ ў канцы 1990-х гадоў, а потым рэалізаваліся ў межах Канцэпцыі развіцця інфармацыйных тэхналогій (2006), Канцэпцыі інфарматызацыі адукацыйнага працэсу (2010) і Стратэгіі ўстановы адукацыі «Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы» на 2016–2020 гады.

Інфармацыйная падтрымка дзейнасці ўніверсітэта развіваецца ў інтарэсах усіх груп нашых спажыўцоў як унутры ўніверсітэта – ад студэнтаў да рэктара, так і па-за ім – ад абітурыентаў да заказчыкаў кадраў. Сёння лічбавізацыя і аўтаматызацыя ахопліваюць усе працэсы і структуры ўніверсітэта, што дазваляе эфектыўна скарачаць дакументазварот за кошт пераходу да выкарыстання карпаратыўных баз даных і развіцця баз ведаў, аўтаматызацыі аналізу і прадстаўлення інфармацыі.

Аўтаматызаваныя сістэмы і базы даных не з’яўляюцца адасобленымі, паколькі інтэграваны паміж сабой і дазваляюць ажыццяўляць кіраванне працэсамі ва ўніверсітэце на падставе комплекснага прадстаўлення інфармацыі, шматканальнага ўзаемадзеяння супрацоўнікаў універсітэта і студэнтаў, узаемасувязі даных з розных крыніц.

ГрДУ імя Янкі Купалы шырока прадстаўлены ў інтэрнэт-прасторы: больш за 50 сайтаў рознага кірунку наведваюць амаль 20 тысяч чалавек штодзень, афіцыйны сайт функцыянуе на пяці мовах, знаходзіцца ў ліку ста самых наведвальных у краіне. Больш за 17 тысяч чалавек – падпісчыкі шасці афіцыйных суполак універсітэта ў сацыяльных сетках. Гэта забяспечвае рост аўтарытэту ўніверсітэта ў краіне і за мяжой, спрыяе прыцягненню абітурыентаў, у тым ліку з-за мяжы, маркетынгу прадукцыі і паслуг, эфектыўнай камунікацыі са спажыўцамі ўнутры ўніверсітэта і па-за яго межамі.

На сучасным этапе лічбавая трансфармацыя ўніверсітэта ажыццяўляецца ў межах прынятага ў 2019 годзе праекта «Лічбавы ўніверсітэт+», асноўная мэта якога – паляпшэнне якасці і эфектыўнасці дзейнасці ўстановы адукацыі шляхам шырокага рэінжынірынгу ўсіх працэсаў і ўкаранення інавацыйных бізнес-мадэлей на падставе мадэрнізацыі яго інфармацыйна-камунікацыйнага асяроддзя.




**Падчас заняткаў з выкарыстаннем інфармацыйных тэхналогій**





Для кожнага студэнта ўніверсітэта на адукацыйным партале функцыянуе асабісты кабінет



Мабільны дадатак «Расклад заняткаў» – адзін з самых папулярных сэрвісаў сярод студэнтаў

Прыярытэтнымі з іх з'яўляюцца наступныя:

• персаналізацыя адукацыйных праграм з улікам патрабаванняў заказчыкаў кадраў і асабістых пажаданняў студэнтаў;

• укараненне дыстанцыйнай формы атрымання адукацыі і пашырэнне выкарыстання дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій;

• пераход да кіравання адукацыйнай і навуковай дзейнасцю і ўніверсітэтам у цэлым на аснове сучасных кіраўнічых і аналітычных інфармацыйных сістэм і адпаведнай інфрастуктуры, якія забяспечаць рэалізацыю ідэй мадэлі «Індустрыя 4.0» у праекцыі на ўстанову вышэйшай адукацыі.

Лічбавая трансфармацыя заключаецца не столькі ва ўкараненні інфармацыйных тэхналогій, колькі ў цэлым з'яўляецца істотнай культурнай і арганізацыйнай зменай ва ўніверсітэце. Далейшае развіццё ГрДУ імя Янкі Купалы прадугледжвае ўкараненне адаптыўных і «празрыстых» для спажыўца працэсаў, працэдур і іх аптымізацыю.

У той жа час рэалізацыя праекта «Лічбавы ўніверсітэт+» дае магчымасць стварыць адзінае інфармацыйна-камунікацыйнае асяроддзе ГрДУ імя Янкі Купалы з выкарыстаннем тэхналогій, якія дазваляюць рэалізаваць асобасна-арыентаваны падыход у адукацыі, аптымальна спалучаць групавыя, калектыўныя, масавыя і індывідуальныя формы работы, пабудаваць сувязь усіх кампанентаў дзейнасці ўніверсітэта, кіраваць ёю як адзіным цэлым, выкарыстоўваць у поўным аб'ёме сінергетычны патэнцыял сукупнасці адукацыйнай, навуковай, выхаваўчай, кіраўніцкай, інфармацыйнай і іншых асяроддзяў.

Дасягненні ўніверсітэта ў развіцці лічбавых сэрвісаў і стварэнні адзінай сістэмы кіравання і рэалізацыі адукацыйнага працэсу адзначаны граматай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь «За эфектыўную працу па ўкараненні інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій у арганізацыю адукацыйнага працэсу і кіраванне ўніверсітэтам». Унікальны вопыт для ўстаноў адукацыі Рэспублікі Беларусь быў прадстаўлены на XXVI Міжнародным ІКТ-форуме «ТИБО-2019», дзе выклікаў значную зацікаўленасць сярод прадстаўнікоў розных устаноў адукацыі Беларусі і краін замежжа. Універсітэт адкрыты для супрацоўніцтва па стварэнні адзінай інфармацыйнай прасторы сістэмы адукацыі, паколькі атрыманыя напрацоўкі могуць паспяхова быць выкарыстаны для аптымізацыі арганізацыі працы ўніверсітэтаў Беларусі і павышэння якасці вышэйшай адукацыі ў нашай краіне.

## Прызнанне ўніверсітэта

За дасягненні ў сацыяльна-культурным развіцці, падрыхтоўку высокакваліфікаваных кадраў і ў сувязі з 70-годдзем з дня заснавання Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт імя Янкі Купалы ў 2010 годзе ўдастоены Ганаровага дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, а ў 2011 годзе адным з першых сярод устаноў вышэйшай адукацыі краіны стаў лаўрэатам нацыянальнага конкурсу «Прэмія Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці» і ўжо тройчы пацвердзіў гэтае званне. У 2018 годзе ГрДУ імя Янкі Купалы на Рэспубліканскім балі выпускнікоў першым у краіне аб'яўлены «Універсітэтам года».

Важнымі ўзнагародамі адзначаны дасягненні Купалаўскага ўніверсітэта і па асобных напрамках дзейнасці: у 2018 годзе газета «Гродзенскі ўніверсітэт» стала пераможцам XIV Нацыянальнага конкурсу друкаваных сродкаў масавай інфармацыі «Золотая литера»; у 2019 годзе ўніверсітэт занесены на Рэспубліканскую дошку пашаны ў намінацыі «Навуковая арганізацыя».

## Нашы дасягненні




ГрДУ імя Янкі Купалы традыцыйна знаходзіцца ў ліку лідараў сярод устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі па выніках міжнародных рэйтынгаў: рэйтынг QS EECA Ranking 2020 – 4-е месца, рэйтынг Webometrics – 3-е месца, рэйтынг UniRank – 2-е месца.

Дасягненні ўніверсітэта – гэта таксама поспехі нашых выпускнікоў, якія маюць значныя вынікі ў прафесійнай, спартыўнай, навуковай і грамадскай дзейнасці. Сярод іх Міністр юстыцыі Рэспублікі Беларусь Алег Сліжэўскі, старшыня Дзяржаўнага мытнага камітэта Рэспублікі Беларусь Юрый Сянько, рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Андрэй Кароль, дырэктар Міжнароднага экалагічнага інстытута імя А. Д. Сахарава БДУ Сяргей Маскевіч, дэпутат Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь сёмага склікання Лілія Кір'як, алімпійская чэмпіёнка Алена Цюнянкова (Валчэцкая), начальнік упраўлення юстыцыі Гродзенскага аблвыканкама Алена Юргель, дырэктар ТРК «Гродна» Мікалай Мельячэнка, старшыня агульнага сходу ўдзельнікаў сумеснага ТАА «Контэ Спа» Валянцін Байко, начальнік філіяла № 400 Гродзенскага абласнога ўпраўлення ААТ «АСБ Беларусбанк» Дзмітрый Краскоўскі, прафесары ГрДУ імя Янкі Купалы Іван Мартынаў, Віктар Таранцей, Ілля Заводнік і інш. У 2018 годзе, у Год малой радзімы, выпускнікі ўніверсітэта розных гадоў заклалі алею ліп па вул. Дубко ў Гродне.




**Дыплом лаўрэата «Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці» ўручыў прэм'ер-міністр Рэспублікі Беларусь Сяргей Румас**

## Да новых вяршынь

80-годдзе альма-матар – гэта не толькі своеасаблівая гісторыя пэўных дасягненняў, якія падкрэсліваюць высокі статус універсітэта, але і пачатак новага перыяду ў развіцці, новых ідэй і праектаў. Сёння ГрДУ імя Янкі Купалы паспяхова развіваецца на аснове прынцыпаў стратэгічнага кіравання і ўпэўнена глядзіць у будучыню. Мы ствараем класічны ўніверсітэт прадпрымальніцкага тыпу, інтэграваны ў сусветную адукацыйную прастору, і перакананы, што ён будзе генератарам ідэй і лакаматывам апераджальнага развіцця асобы, рэгіёна і краіны, стане адукацыйна-навукова-вытворчым комплексам, пабудаваным на канцэпцыях мадэлі «Індустрыя 4.0». Для гэтага ў нас ёсць унікальны вопыт, адкрыты інавацыям прафесійны калектыў, таленавітая моладзь і шчырае жаданне працаваць дзеля будучых поспехаў і дасягненняў. Адзінства і сумесныя намаганні дазволяць нам і далей захоўваць дынаміку развіцця, рыхтаваць таленавітыя кадры, падтрымліваць высокі аўтарытэт аднаго з прэстыжных універсітэтаў краіны!



**Дзень ведаў на Плошчы ўніверсітэцкага сцяга**